# ПАГАДНЕННЕ АБ СУПРАЦОЎНІЦТВЕ

## ПАМІЖ КАМІТЭТАМ ДЗЯРЖАЎНАГА КАНТРОЛЮ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ І ВЫШЭЙШАЙ ПАЛАТАЙ КАНТРОЛЮ РЭСПУБЛІКІ ПОЛЬШЧА

Камітэт дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь і Вышэйшая Палата Кантролю Рэспублікі Польшча, якія ў далейшым называюцца Бакамі,

дзейнічаючы згодна з палажэннямі Дагавора паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Польшча аб добрасуседстве і дружалюбным супрацоўніцтве ад 23 чэрвеня 1992 г.,

надаючы важнае значэнне ўмацаванню дружалюбных адносін паміж Бакамі як членамі INTOSAI і EUROSAI,

кіруючыся прынцыпамі ўзаемапавагі, даверу, раўнапраўя, партнёрства і супрацоўніцтва,

выяўляючы ўзаемнае імкненне да вывучэння практыкі рэалізацыі функцый дзяржаўнага фінансавага кантролю, прынцыпаў, механізмаў і метадаў яго ажыццяўлення з мэтай павелічэння эфектыўнасці кантрольнай дзейнасці,

дамовіліся аб наступным:

### Артыкул 1

Бакі ў рамках сваёй кампетэнцыі супрацоўнічаюць па наступных галоўнах накірунках:

- абмен вопытам у галіне метадалогіі і парадку ажыццяўлення дзяржаўнага фінансавага кантролю;
- узаемадзеянне ў галіне прафесійнага навучання і павышэння кваліфікацыі кадраў;
- правядзенне паралельных кантрольных мерапрыемстваў;
- інфармацыйны абмен.

Бакі ў рамках сваёй кампетэнцыі развіваюць супрацоўніцтва і ўзаемадапамогу ў іншых накірунках, што складаюць узаемны інтарэс.

### Артыкул 2

Пры абмене інфармацыяй і матэрыяламі ў рамках гэтага Пагаднення кожны з Бакоў кіруецца дзеючым заканадаўствам сваёй дзяржавы, якое рэгулюе ўдзел у міжнародным інфармацыйным абмене і абарону дзяржаўных сакрэтаў і іншай ахоўваемай законам тайны.

**Артыкул 3**

Кожны з Бакоў гарантуе сакрэтнасць атрыманай інфармацыі ў выпадку, калі Бок, які перадае інфармацыю, лічыць непажаданым распаўсюджанне яе зместу.

**Артыкул 4**

Кожны з Бакоў пры выкананні гэтага Пагаднення карыстаецца сваёй дзяржаўнай мовай.

**Артыкул 5**

Бакі практыкуюць узаемнае накіроўванне дэлегацый з мэтай абмена вопытам у галіне ажыццяўлення і ўдасканальвання кантрольнай дзейнасці, прафесійнай падрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі сваіх супрацоўнікаў. Бакі ўзаемадзейнічаюць па пытаннях арганізацыі і правядзення семінараў, канферэнцый і кансультацый, ажыццяўляюць абмен актамі нацыянальнага заканадаўства, прафесійнай інфармацыяй і методыкамі, якія датычацца пытанняў ажыццяўлення кантролю.

**Артыкул 6**

Пры ажыццяўленні мерапрыемстваў у рамках гэтага Пагаднення кожны Бок бярэ на сябе расходы, звязаныя з камандзіраваннем сваіх дэлегацый, супрацоўнікаў і стажораў, калі Бакі не дамовяцца папярэдне аб іншым.

**Артыкул 7**

Бакі могуць падпісваць пратаколы з пералікам канкрэтных мерапрыемстваў, тэрмінаў іх правядзення, фінансавых і іншых умоў іх рэалізацыі.

Парадак арганізацыі і правядзення гэтых мерапрыемстваў вызначаецца па дамоўленасці паміж Бакамі.

**Артыкул 8**

Палажэнні гэтага Пагаднення могуць быць спынены, зменены і дапоўнены па ўзаемнай дамоўленасці Бакоў.

**Артыкул 9**

З днём уступлення ў сілу дадзенага Пагаднення прызнаць страціўшым сілу Пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Кантрольнай палатай Рэспублікі Беларусь і Вышэйшай Палатай Кантролю Рэспублікі Польшча, заключанае 19 мая 1994 г. у г. Мінску.

**Артыкул 10**

Гэта Пагадненне ўступае ў сілу з дня падпісання і будзе дзейнічаць на працягу двух гадоў. Дзеянне гэтага Пагаднення аўтаматычна прадаўжаецца на наступны двухгадовы перыяд, калі ні адзін з Бакоў не пазней чым за тры месяцы да заканчэння тэрміну дзеяння гэтага Пагаднення пісьмова не паведаміць іншаму Боку аб сваім намеры спыніць яго дзеянне.

Заключана 17 лістапада 2003 г. у г. Варшаве ў двух экземплярах, кожны на беларускай і польскай мовах, прычым абодва тэксты маюць аднолькавую сілу.

**За Камітэт дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь**

**За Вышэйшую Палату Кантролю Рэспублікі Польшча**